Носков Т.В., студент 250 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель– Колобова И.Н.,
кандидат исторических наук, доцент

# ПАЛЕШУКІ ЯК ЭТНІЧНАЯ ГРУПА: МОВА, ТРАДЫЦЫІ, МЕНТАЛІТЭТ

Актуальнасць абранай мною тэмы заключана ў вялізнай значнасці, памерах і адметнасці палешукоў як этнічнай групы, а таксама ў іх ўзаемаадносінах з беларускім і ўкраінскім этнасамі.

Мэта работы – даследаваць гісторыю і вывучэнне палешуцкага этнасу, яго развіццё на працягу доўгага часу, а таксама яго сучаснае становішча.

Шмат вядомых беларускіх даследчыкаў займаліся пытаннем палешукоў [1]. Ю. Талько-Грынцевіч у кнізе "К антропологии народностей Литвы и Белоруссии" выдзяліў палешукоў у асобную групу, адзначыўшы пры гэтым іх блізкасць да беларусаў [7]. П. Шпілеўскім у кнізе "Путешествие по Полесью и белорусскому краю" было праведзена даследаванне палескай мовы (“смесь древне-литовской, русской, малороссийской и польской”), вынясенне яе на адзін узровень з беларускай і ўкраінскай і пазначэнне межаў яе распаўсюджвання (Замосце, Краснастаў, Хелм, Седэльцы, Міжрэчча і ўвогуле Падляшша) [8, с. 11, 26]. А. Кіркор адзначаў палешукоў як прадстаўнікоў асабістага этнасу, называючы іх нашчадкамі племені Будзінаў і "прыроднымі кансерватарамі" [3, с. 345]. Аднак не ўсе даследчыкі згаджаліся з такімі поглядамі і адназначна далучалі жыхароў Палесся да ўкраінскага ці беларускага народу. Да першых, напрыклад, адносіў палешукоў Я. Карскі, пазначыўшы гэта ў 1903 г. на сваёй этнаграфічнай мапе [9]. Да другіх жа адцягваў той жа М. Доўнар-Запольскі, які здзейсніў некалькі паездак на Піншчыну ў 1890 г. Вынікі даследаванняў ён апісаў у працы "Песни Пинчуков" [2].

Як мы можам пабачыць, палешуцкае пытанне ўжо больш за стагоддзе выклікае дыскусіі, спрэчкі і з'яўленне новых, часта супрацьлеглых тэорый, што толькі павялічвае цікавасць да яго.

Палешукі жылі, развіваліся і абрасталі сваімі традыцыямі і ўстоямі яшчэ з часоў Кіеўскай Русі. Заўсёды яны былі своеасаблівымі людзьмі, якія даволі дрэнна і марудна пераймалі нешта ад сваіх суседзяў і не асабліва спяшаліся кудысьці наперад. Вязкія балоты і дрыгвы, глухія пушчы і лясы зрабілі такімі жа і сваіх суседзяў-людзей. Маўклівыя, працавітыя, блізкія да прыроды і насычаныя старажытнымі традыцыямі, якія выйшлі з язычніцтва – вось якімі сталі палешукі на працягу свайго доўгага шляху. Яны пражылі некалькі дзяржаў, бачылі не адну манаршую асобу, але ўсё жылі і жылі сваім ціхім жыццём. Такі лад звычайна не трапляе на старонкі летапісаў, ды і самі палешукі пакідалі няшмат інфармацыі пра сваё мінулае нашчадкам. І гэта толькі мацней прымушае глыбей акунуцца ў доўгае і вялізарная вывучэнне і адкрыццё невядомых старонак палешуцкай гісторыі.

Адкуль жа мы бярэм большую частку таго, што ведаем пра іх? З унікальнай палешуцкай мовы, традыцый, абрадаў, касцюмаў – усяго таго, што пранеслі яны з сабой скрозь стагоддзі, захаваўшы да нашых часоў.

Пяройдзем да адной з асноўных частак гэтага спісу – мовы. У афіцыйных крыніцах яна завецца палескай ці заходне-палескай. Лічыцца, што на яе фармаванне моцны ўплыў аказала памежнае існаванне. Паміж Берасцейскай зямлёю і Пінскай, паміж польскімі і вялікакняскімі тэрыторыямі – такое становішча не магло не паўплываць на гаворку мясцовых жыхароў. Яе адметнымі рысамі з'яўляюцца: оканне, цвёрдасць большасці гукаў, мяккія шыпячыя, адсутнасць дзекання і цекання і шмат чаго яшчэ. Ужо ў XVI ст. з'яўляюцца звесткі аб ўжыванні палескай мовы. У XIX ст. яна ўжываецца ў пісьмах і некаторых творах вядомага публіцыста і паэта, удзельніка "Дэмакратычнага таварыства" Ф. Савіча. Таксама на ёй пісаў вядомы гісторык і этнолаг, адзін з заснавальнікаў Беларускага ўніверсітэту М. Янчук. У пачатку XX ст. аб палескай мове загаварылі з новымі сіламі. Як сцвярджаў вядомы

этнограф М. Каспяровіч, пры распрацоўцы аднаго з найвядомейшых беларускіх буквароў "Беларускага лерманта, або першай навукі чытання" К. Каствіцкім (Карусём Каганцом) уводзілася ідэя далучэння ў гэты падручнік заходнепалескіх слоў. Ідэя гэтая, нажаль, не дажыла да выхаду буквару, але ўсё ж такі некалькі палескіх “гасцей” апынуліся на яго старонках [4, с. 96–97]. Пачынаючы жа з 1980-х гг. мінулага стагоддзя і да нашых дзён адной з галоўных фігур, якія займаюцца вывучэннем, правядзеннем у норму згодна з сучаснацю і распаўсюджваннем мовы палешукоў, з'яўляецца беларускі журналіст і філолаг М. Шэляговіч. Ён бароніць ня толькі самастойную палескую мову, але і культуру Палесся ўвогуле, адстойваючы ідэю аўтаноміі дадзенага рэгіёну. Значнай часткай развіцця сучаснай палескай мовы пад яго даглядам з'яўляліся газеты "Балесы (галасы) Полісься" і "Збудінне" [5].

Звернемся цяпер да палешуцкіх традыцый і абрадаў. Яны ўяўляюць сабой найцудоўнейшае спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх абрадаў. Як і ўсе традыцыі яны непісьмова перадаваліся ад дзядоў бацькам, а ад іх сынам. Таму апошнія пакаленні ўжо ня ведаюць сэнсу некаторых дзеянняў і проста робяць іх так, як завяшчалі ім дзяды. Але дзякуючы намаганням даследчыкаў мінулых часоў, мы можам заглянуць у патаенныя куткі гэтых спраў. Адным з самых значных твораў па гэтай тэме з'яўляецца зборнік "Пінчукі" за аўтарствам фалькларыста Д. Булгакоўскага. Указваючы на замкнёнасць мясцовых жыхароў, для якіх паездка ва ўездны горад была вялізнай падзей, а Менск наогул лічыўся "клятай Літвою" з аднымі толькі палякамі-каталікамі, ён у той жа час заўважаў, што гэта адыграла вялізарную ролю ў яскравым развіцці іх традыцый і абрадаў. Напоўніўшы сваё наваколле міфічнымі істотамі, магічнымі рытуаламі і своеасаблівымі паняццямі аб замагільным жыцці, палешукі стварылі асобны свет, які ўражвае сваёй штучнасцю [6, с. 6]. Буськавы лапы, Варовыты дзень, адметныя рысы ў распаўсюджаных святах, вялічэзная колькасць пахавальных абрадаў – усё гэта адкрылася Булгакоўскаму і прывяло яго да рашэння падзяліцца гэтым скарбам з

сучаснікамі і сахраніць яго дзеля нашчадкаў [6, с. 178–180]. Чуць болей засяродзімся на пахаванні, таму што гэта адна з самых добра захаваўшыхся традыцыйных частак. У апошнім шляху палешукі прадумвалі ўсё да самых маленькіх дробязяў: колькі дзён, колькі чалавек, паводзіны, размовы з нябожчыкам, сумеснае жыццё з адыходзячай душою і шмат чаго яшчэ. У абставінах, калі многія паселішчы знаходзіліся сярод вады, яны мелі асобныя пахаванні з адпраўкай цела па вадзе [6, с. 185–188]. І гэта толькі малюсенькі кавалачак ад вялізарнага багацця палешукоў. Таму чалавек, які зацікавіўся гэтай тэмай, адкрые зашмат найцікавейшых момантаў і ніколі не будзе расчараваны акунаннем у гэты чароўны свет.

І што жа ў выніку? А тое, што палешукі месцамі замкнёныя, няспешныя, але ўпартыя, са сваёй мудрагелістай мовай і традыцыямі але самае галоўнае – гэта самастойны этнас. Не беларусы, украінцы ці тым больш палякі. Яны – палешукі і нам патрэбна прызнаць за імі права быць палешукамі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Антропология Беларуси в исследованиях конца XIX – середины XX в. / Нац. АН Беларуси, Ин-т истории ; [сост.: О. В. Марфина и др.] . – Минск : Бел. навука, 2017 . – 454 с. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : //catalog.msu.by/opac/app/webroot/index.php?url=/notices/index/IdNotice:353778/Source:default. – Дата доступу : 10.03.2023.

2. Довнар-Запольский, М. В. Песни пинчуков / М. В. Довнар-Запольский – М.: Книга по Требованию, 2011. – 242 с. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://www.google.com/url?sa=t&source=web&rct=j&url=https://www.bookvoed.ru/files/3515/72/38/6.pdf&ved=2ahUKEwiFioHrsN_9AhUC6aQKHQQeD3EQFnoECBAQAQ&usg=AOvVaw2BXBfKw-ZDK1RDssmFlOgH Дата доступу : 10.03.2023.

3. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном экономическом и бытовом значении / под ред.

П. П. Семёнова. – Т. 3. – Ч. I. Литовское Полесье. – Ч. II. Белорусское Полесье. – СПБ – М. : Типография М. О. Вольфа, 1882. – 345 с. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://by.ethnology.ru/by_lib/j_russia/graf/j_russia.html?1. – Дата доступу : 10.03.2023.

4. Каспяровіч, М. І. Карусь Каганец (да 10-й гадавіны сьмерці) / М. І. Каспяровіч. – Менск : Маладняк, № 10, 1928. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://digital.nlb.by/items/show/2783 – Дата доступу :10.03.2023.

5. Пазацэнзурны пэрыядычны друк Беларусі (1971 – 1990). Каталёг. – Менск, 1998. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://slounik.org/153720.html. – Дата доступу :10.03.2023.

6. Пинчуки : Этнографический сборник : песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь / собрал в Пинском уезде Минской губ. Д. Г. Булгаковский ; [под ред. Ф. Истомина]. – С.-Петербург : тип. В. Безобразова и К°, 1890. – [2], VI, 201 с. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу : https://www.prlib.ru/item/436931? – Дата доступу : 10.03.2023.

7. Талько-Гринцевич, Ю. К антропологии народностей Литвы и Белоруссии / Ю. Талько-Гринцевич // Тр. Антропологического общества при Военно-медицинской академии. – М., 1867. – Т. 1. – Вып. 1. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://catalog.msu.by/opac/app/webroot/index.php?url=/notices/index/IdNotice:353884/Source:default. – Дата доступу : 10.03.23.

8. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский. – СПб., 1858 (2016). – [2], 242 с. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://elib.rgo.ru/safe-view/123456789/216856/1/MTAwMDAyMzdfU2hwaWxldnNraXksIFBhdmVsIE1pa2hheWxvdmljaCAoMTgyNy0xODYxKS4gUHV0ZXMucGRm – Дата доступу: 10.03.2023.

9. Этнаграфічная мапа беларусаў (прафэсар Я. Карскі, 1903).